# Самабытны мастак слова





АТТЕСТАТЪ

Данъ отъ Учебно-хозяйственнаго Совѣта Горецкаго землемѣрно-агрономическаго училища, на основаніи § 8 ВЫСОЧАЙШЕ утвержденнаго 19 апрѣля 1909 года Положенія о Горецкомъ землемѣрно-агрономическомъ училищѣ, за надлежащимъ подписомъ и приложеніемъ печати Горецкому Максиму Ивановичу въ томъ, что онъ поступилъ въ число учениковъ означеннаго училища въ 1909 году и, находясь въ ономъ по 1913 годъ, окончилъ полный курсъ теоретическаго и практическаго ученія, причемъ оказалъ слѣдующіе успѣхи:

1) ПО ОБЩЕОБРАЗОВАТЕЛЬНЫМЪ ПРЕДМЕТАМЪ отличные (5-) (Законъ Божій, русскій языкъ, отечествовѣдѣніе, алгебра, геометрія, тригонометрія, космографія, законовѣдѣніе);

**У гэтыя лютаўскія дні спаўняецца 120 гадоў з дня нараджэння аднаго з пачынальнікаў беларускай прозы, вучонага, педагога Максіма Іванавіча Гарэцкага (1893-1938).**

За сваё непрацяглае жыццё ён здолеў стварыць значную колькасць літаратурных твораў, якія па праву папоўнілі скарбніцу беларускай і сусветнай літаратуры і выклікаюць вялікую цікавасць як з боку чытачоў, так і з боку літаратуразнаўцаў.

Шырокая адукаванасць, дапытлівасць, аналітычны склад розуму дазволілі М.Гарэцкаму праявіць сябе ў навуцы, прынамсі добрым даследчыкам літаратуры, мовазнаўцам, фалькларыстам. Ён з'яўляўся праўдзейным членам Інбелкульта, выконваў абавязкі вучонага сакратара літаратурнай камісіі, працаваў вучоным спецыялістам Інстытута навуковай мовы Інбелкульта, застаючыся на гэтай пасадзе і пасля яго рэарганізацыі ў Акадэмію навук. М.Гарэцкі напісаў шэраг літаратуразнаўчых і крытычных артыкулаў, выдаў падручнік па гісторыі беларускай літаратуры, які доўгі час быў адзіным падручнікам для школ і ВНУ, склаў «Хрэстаматыю беларускай літаратуры. XI век – 1905 г.» (1922). Як пісьменнік і вучоны-мовазнаўца М.Гарэцкі шмат зрабіў для ўзбагачэння беларускай літаратурнай мовы, клапаціўся пра нормы беларускага правапісу. Разам з братам Гаўрылам склаў і выдаў «Руска-беларускі слоўнік» (1918) – першы вынік працы ў галіне лексікаграфіі. Праз год у Вільні быў выдадзены «Невялічкі беларуска-маскоўскі слоўнічак» (1919), а ў 1924 годзе з'явіўся падрыхтаваны сумесны з М.Байковым «Практычны расійска-беларускі слоўнік».



Браты М. а Г. ГАРЭЦКІЯ

Руска-Беларускі

СЛОЎНІК.

СМАЛЕНСК, 1918.

Друкарня Атдзела Народнае Асьветы.



КАРОТКІ

Руска-Беларускі

СЛОЎНІК.

А.

Августъ—Жнівень.
Агонія—Каленчынньня.
Адъ—Пекла.
А если, а вдругъ—Нойды.
Аистъ—Бусел, буцян.
Азартно—Азардоўна.
Аляповато—Лапезна.
Амбаръ—Клець, сьвіран.
Анютины глазки (цвѣтокъ)—Браткі.
Анъ, анъ вотъ—Аж.
Апатія—Апешаласьць.
Апрѣль—Сакавік.
Аренда—Ранда.
Арендная плата—Рата.
Артистъ—Артысга, мастак.
Ахъ—Ай, агу, авохці, авой.

Яшчэ ў дзяцінстве М.Гарэцкі з замілаваннем слухаў пранікнёныя, прыгожыя матчыны спевы, пазней занатоўваў іх, збіраў іншыя творы беларускага фальклору. У выніку ў 1928 годзе разам з кампазітарам А.Ягоравым выдаў кніжку «Народныя песні з мелодыямі», у якой былі сабраны 318 песень, запісаных ад маці.

Педагагічныя здольнасці М.Гарэцкага знайшлі сваё развіццё пад час працы ў Віленскай беларускай гімназіі, пры падрыхтоўцы латышскіх беларусаў на настаўніцкіх курсах у Дзвінску, на лекцыях па беларускай мове і літаратуры на рабфаку БДУ, Камуністычным універсітэце БССР, у Горыцкай сельскагаспадарчай акадэміі, дзе М.Гарэцкі ўзначальваў кафедру беларускай мовы і літаратуры, рыхтаваў маладых і таленавітых літаратараў – членаў літаратурнага аб'яднання «Маладняк».

Да юбілейнай даты ў ЦНБ НАН Беларусі на аснове шматлікіх архіўных і друкаваных матэрыялаў з фонду аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў падрыхтавана выстаўка пад назвай «Браму скарбаў сваіх адчыняю…», якая распавядае пра жыццёвы і творчы шлях М.Гарэцкага, дае ўнікальную магчымасць зазірнуць у яго творчую майстэрню. З дазволу пляменніка М.Гарэцкага акадэміка Радзіма Гарэцкага ўпершыню ўвазе наведвальнікаў прапанавана рукапісная спадчына пісьменніка: першыя спробы пяра, рукапісы апавяданняў, аповесцей, абразкоў, замалёвак, накідаў за розныя гады, шматлікія літаратурныя нарыхтоўкі да задуманых і фрагменты незавершаных твораў. Так, вялікую цікавасць выклікаюць вучнёўскія сшыткі з рукапісам «Камароўскай хронікі» – своеасаблівым летапісам сялянскага, сямейнага жыцця, дзе аўтар імкнуўся адлюстраваць лёс беларускага народа ад прыгоннага права да сучаснасці; пераклад на рускую мову «Віленскіх камунараў»; шматлікія накіды і фрагменты аднаго з апошніх, так і недапісаных твораў «Скарбы жыцця», дзе адлюстроўваецца драматызм становішча рэпрэсіраванага пісьменніка, яго роздумы аб сутнасці жыцця. На думку даследчыкаў творчасці М.Гарэцкага, «Скарбы жыцця (Лебядзіная песня)» лічацца своеасаблівай споведзю яго душы, тэстаментам нашчадкам. Сярод іншых рукапісных дакументаў – фальклорныя запісы М.Гарэцкага.

Друкаваная спадчына пісьменніка шырока прадстаўлена публікацыямі ў перыядычным друку, асобнымі выданнямі. Так, дэманструюцца першае друкаванае апавяданне М.Гарэцкага пад назвай «У лазне», змешчанае ў газеце «Наша ніва» за 1913 год пад псеўданімам Максім Беларус, і першы зборнік апавяданняў «Рунь» (1914), чатыры выданні «Гісторыі беларускай літаратуры», «Хрэстаматыя беларускай літаратуры. XI век – 1905 год», слоўнікі і іншыя прыжыццёвыя і сучасныя выданні, у тым ліку і зборы твораў.

У архіве пісьменніка захаваліся тры кнігі з дароўнымі надпісамі Якуба Коласа, які аказаў значны ўплыў на развіццё творчага таленту Гарэцкага-літаратара. Іх таксама можна ўбачыць на выстаўцы.

У асобным раздзеле экспазіцыі сабраны энцыклапедычныя даведнікі з артыкуламі пра М.Гарэцкага, цікавыя ўспаміны яго родных, змястоўныя літаратуразнаўчыя даследаванні вядомых беларускіх навукоўцаў і інш.

Аздабляюць экспазіцыю старыя фотаздымкі: М.Гарэцкага, яго родных і блізкіх, сяброў. Частка фатаграфій – з сямейнага альбома Р.Гарэцкага.

Урачыстае адкрыццё юбілейнай экспазіцыі адбылося ў дзень нараджэння Максіма Гарэцкага – 18 лютага 2013 года.

**Марына ЛІС, Тацяна ЖУК,**
**навуковыя супрацоўнікі ЦНБ НАН Беларусі**